пасмяецца над імі". Гэта выхадка віленскіх манетчыкаў справакавала такое абурэнне каронных падданых Жыгімонта Аўгуста, што вымусіла яго афіцыйным універсалам забараніць выпуск гэтай манеты[2; 4].

Асноўныя звёны манетнай сістэмы, якая існавала ў ВКЛ, матэрыяльна ўвасабляліся аболам, дэнарыем, падвойным дэнарыем, паўгрошам, грошам і вытворнымі ад яго наміналамі (падвойным, патройным, учацвяроным і ушасцяроным драбязой), талерам і дукатам.

Літаратура:


1. Кокореко В. Монетный двор в Тыкоцине. // Банковский вестник – 2006, № 2, С. 19 – 25.
2. Орлов А. Когда белорусы были литвинами. // Банковский вестник – 2007, № 1, С. 66 – 69.
3. Рулецкі Дз. Рэдкія манеты Жыгімонта Старога 1508 – 1529 гг. у зборах найвялікшых польскіх музеяў. // Банковский вестник – 2007, № 2, С. 55 – 61.
4. Рулецкі Дз. Традыцыйныя грашовыя сістэмы ў 16 – 17 ст.: троякі і таляры. // Банковский вестник – 2007, № 3, С. 66 – 68.
5. Рулецкі Дз. Фальшаванне манет РП. // Банковский вестник – 2001, № 6, С. 66 – 69.
6. Рябцевич В.Н. Нумизматика Беларуси. Мн., 1996.


## «ТЭАТР АГІНСКАГА Ў СЛОНІМЕ»


УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт»

***Чугунова М.П., ЛФ***

Навуковы кіраўнік – к.г.н., дацэнт, выкладчык кафедры гуманітарных навук М.П. Стасевіч


Багатая і цікавая гісторыя Слоніма захоўвае нямала падзей і імёнаў, вартых увагі і памяці нашчадкаў. Сярод іх і імя вялікага гетмана літоўскага Міхала Казіміра Агінскага, які быў старастай слонімскім з 60 – гадоў 18 стагоддзя і да канца стагоддзя. Гэты буйнейшы магнат Вялікага княства Літоўскага прэтэндаваў і на карону Рэчы Паспалітай, але пацярпеўшы ваеннае і палітычнае паражэнне, пасяліўся у Слоніме і ўсю сваю вялікую энергію, талент і сродкі накіраваў на будаўніцтва рэзідэнцыі і добраўпарадкавання горада.

Самай каштоўнай часткай пасагу Аляксандры Сапега, роджанай Чартарыйскай, якую яна прынесла свайму другому мужу Міхаілу Казіміру Агінскаму, калі яны пажаніліся ў 1761 годзе, была слонімская эканомія. Гэты дзяржаўны маёнтак быў адным са шматлікіх, якія належалі Антону

Репозиторий ГрГМУ

Міхалу Сапегу. Маёнтак размяшчаўся паблізу павятовага горада з яго земскім судом і таму падканцлер вырашыў зрабіць менавіта слонімскі маёнтак сваім асноўным месцазнаходжаннем.

Слонімскі замак да канца свайго існавання заставаўся даволі сціплым збудаваннем. Рэзідэнцыя налічвала 46 пакояў і нагадвала хутчэй шыроказразгалінаваны, правільнай канструкцыі двор, чым узор французкай палацавай архітэктуры, ад якой перш за ўсё рознілася сваёй аднапавярховай формай. Пры Агінскім быў павялічаны парк, што акружаў замак, вакол узведзены шматлікія будынкі. У час кіраўніцтва ўзнікаюць тут невялікі палац і шэраг паркавых павільёнаў – такіх як зала багінь, альтанка Геркулеса, англійская гасціная і іншыя. Акрамя гэтага – дамы для артыстаў і прыдворных служачых і, нарэшце, у больш позні час – асобны будынак тэатра.

Паколькі інтэнсіўнасць тэатральнага жыцця ўзрастала, а колькасць пастановак, якія часам патрабавалі складанага абсталявання, павялічвалася, тагачасныя мажлівасці Слоніма аказаліся недастатковымі. З гэтай прычыны ў канцы семідзесятых гадоў распачалося будаўніцтва асобнага тэатральнага будынка, так званага “опернага тэатра” (“Опергаўза”), які быў узведзены ля рэчкі, за замкам паводле плана вядомага італьянскага тэатральнага архітэктара і дэкаратара Іначэнца Мараіна.

Мараіна, ураджэнец з Лугано, выхаванец Акадэміі Брэра ў Мілане, упершыню пачаў працаваць у Рэчы Паспалітай у 1767 годзе, калі размалёўваў адну з залаў ва Уяздоўскім замку. У Слоніме ён паяўляецца 1 чэрвеня 1777 года, дзе зарабляе на той час высокую месячную плату ў 12 дукатаў. У чэрвені-жніўні 1791 года Мараіна завяршае грунтоўную перабудову Польскага тэатра на плошчы Красінскага ў Варшаве. Гэтая надзвычай удалая рэканструкцыя прынесла яму значную славу.Гэты выдатны майстра тэатральнай архітэктуры стаў творцам новага опернага тэатра.

Непасрэдныя работы па ўзвядзенню тэатра пачаліся ў 1780 годзе. Работы, напэўна, вяліся хутка, таму што ў тым жа годзе шкляр Адам Шміт нарыхтаваў дзевяць большых і 18 меншых вокнаў, а таксама шкляныя дзверы. У кастрычніку бляхар Фішэль абабіў два дымаходы і зрабіў рыну. У наступным годзе былі выкананы некаторыя заключныя работы.

Асабліва старанна вяліся работы перад візітам Станіслава Аўгуста, які адбыўся ў верасні 1784 года. Перад візітам караля было вырашана, негледзячы на адсутнасць гетмана, правесці грунтоўныя рамонтныя работы, прычым над нязначнымі зменамі працавалі амаль цэлы месяц 23 цесляры. Акрамя іх да працы было прыцягнута некалькі муляроў. Работы вяліся днём і ноччу. Было ўстаноўлена 400 круглых лямпаў. Гэтыя лямпы служылі для асвятлення канала, які запаўняўся вадой пры паказе на сцэне марскіх баёў. Для тэатра былі зроблены два фантаны з адпаведнымі

Рэпазіторый ГрДМУ

прыстасаваннямі для выкарыстання іх на сцэне. Работы па будаўніцтву тэатра былі скончаны у кастрычніку. Будынак Слонімскага опернага тэатра выклікаў здзіўленне сучаснікаў.

У вядомым рэестры за 1797 год Слонімскі тэатр апісваецца наступным чынам: “Оперны тэатр вялікі і мураваны. За флігелем замка, крыху ніжэй, паблізу балота і рэчкі стаіць велічны пакрыты чарапіцай будынак опернага тэатра, на пярэднім фасадзе якога размешчаны вялікія двухстворкавыя дзверы з унутраным замком і ключом, а таксама з іншымі прыстасаваннямі. Унутры, паблізу ад гэтых дзвярэй лесвіца вядзе да ложаў, размешчаных па абодва яе бакі; ва ўсіх ложах дзверы стаяць без замкоў, а вокны – без шыбаў. У партэры размешчаны змайстраваныя сталярамі лаўкі з дошак, разлічаныя на вялікую колькасць гледачоў. Тэатр з яго дэкарацыямі даволі занядбаны; на другім баку, побач з тэатрам, шэсць абшарпаных пакойчыкаў. У партэры – дзве белыя печы”... (спіс работ па будаўніцтву слонімскага палаца). – Бібліятэка ПАН у Кракаве. Рук.385.

Слонімскі тэатр быў прыблізна ў два разы меншы, чым Нясвіжскі. Ён нагадваў больш тэатр у Беластоку. К. Скібінскі, які наведаў Слонімскі тэатр у 1804 годзе, пісаў, што ў кожнай ложы была паркетная падлога і камін. Каралеўская ложа вылучалася багата ўпрыгожаным картушам з гербам манарха. Асвятляўся будынак раскошнай крыштальнай люстрай, а можа і некалькімі, а таксама шматлікімі размешчанымі каля сцен лямпамі і насценнымі свяцільнікамі са спецыяльнай падстаўкай.(Kazimierz Skibipski.Pamiethik Aktora.Warsawa,1912.S13)

Для таго, каб можна было ставіць спектаклі, выкарыстоўваліся самыя найлепшыя тэхнічныя сродкі, якія дазвалялі лёгка мяняць дэкарацыі, а пры неабходнасці “выводзіць” на сцэну нават сапраўдныя караблі. Дзеля гэтага сцэна была падзелена на дзве часткі. Пярэдняя выкарыстоўвалася па сваім непасрэдным прызначэнні і на ёй ігралі акцёры. Задняя частка сцэны лёгка запаўнялася вадой, калі гэта было неабходна. Паступала вада з канала, які знаходзіўся побач, праз сістэму труб, што праходзілі да самых тэатральных падмосткаў. Пра наяўнасць складаных водных прыстасаванняў сведчыць А.Анджаеўскі, які наведаў Слонім у 1798 годзе і быў зачараваны замкам і “пышным тэатрам, у якім была сапраўдная сажалка, што несла сапраўдныя караблі і ўяўляла сабой чароўную карціну” (Antoni Andrzejowski. Ramoty Starego Detiuka o Wotyniu.Wilno, 1914.T1.S176). З тыльнага боку сцэны адкрывалася вялізная брама, праз якую магла ўварвацца кавалерыя ці прайсці пехота. На сцэне нават прадугледжваліся фантаны з падсветкай бенгальскімі агнямі. Пры тэатры тады працаваў спецыяльны піратэхнік Ваксмунт.

Тэатр у Слоніме быў прыкладам дасканала абсталяванага познебарочнага тэатра, які меў выдатнае тэхнічнае забеспячэнне і сваім памерам не ўступаў гарадскім тэатральным будынкам.

Рэпазіторый ГрДМУ

На сцэне тэатра адбываліся тэатральныя і оперныя прадстаўленні, якім па праву горад Слонім абавязаны сваёй славай.

Мяркуецца, што пры двары Міхала Агінскага ў Слоніме ўжо ў 1765 годзе існавала невялікая капэла, якая складалася з 12 выканаўцаў. Гэты былі таленавітыя музыканты, верагодна прывезеныя магнатам у Слонім разам з прыдворнай абслугай. У 1776 годз інструментальны ансамбль налічваў 53 выканаўцаў. Асноўную частку ансамбля складалі прыгонныя сяляне, якія музычную падрыхтоўку атрымалі пры двары. Ансамбль вакалістаў і інструменталістаў не ўступаў самым лепшым музычным калектывам Заходняй Еўропы. Кіравалі ансамблем запрошаныя з-за мяжы Ю.Паўліні і А. Данэзі. Нязначная частка вядучых салістаў была запрошана з Германіі, Чэхіі, Італіі.

Пры тэатры Агінскага дзейнічала і балетная школа. Спачатку сярод вучняў пераважалі дзеці прыдворных музыкантаў, а пазней балетам займаліся і дзеці прыгонных сялян. Вучні атрымлівалі пэўную агульную адукацыю. У 1788 годзе чатыры выхаванцы выступалі нават у балеце “Рыбакі” ў Варшаве. У 1790 годзе балетная школа была на гасторолях на Украіне. У гастролях прымалі ўдзел 20 артыстаў. Найбольшага росквіту балетная трупа і школа дасягнулі ў 1782-1790 гадах, калі кіраваў імі балетмайстар і кампазітар Ф.Марыні і выдатны педагог слонімскага балета Ф.Шлянцоўскі. Слонімскі балет тэатра Агінскага заўсёды канкурыраваў з каралеўскім тэатрам у Варшаве. Напрыканцы 1792 года балетная школа была пераведзена ў мястэчка Целяханы Івацэвічскага раёна.

Не выпадкова, у тыя часы Слонім называлі “Палескімі Афінамі”. А ў святочныя дні чароды варшаўскіх экіпажаў з багатай знаццю сцякаліся сюды, каб дакрануцца да цудоўнай правінцыяльнай прыгажосці і культуры. Прыязджалі знакамітасці і з іншых гарадоў.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай і паўстання Тадэвуша Касцюшкі, слонімская рэзідэнцыя Агінскага канфіскуецца і хутка прыходзіць у заняпад. У 1795 годзе тэатр Міхала Казіміра Агінскага ў Слоніме ўжо не існаваў. Калі горад наведаў рускі цар Аляксандр 1 і паэт, князь Пётр Вяземскі, то ўбачылі яны толькі развалiны тэатра. Так жа неміласэрна абышоўся лёс і з самім замкам, са службовымі і адміністрацыйнымі будынкамі, а таксама з паркам. Пасля васьмідзесяці гадоў царскага панавання нават руіны ўжо не сведчылі пра месцазнаходжанне “Палескіх Афінаў”...

Палац і “Опера” не захаваліся да нашых дзён, але засталася “аўстэрыя” – былы заездны дом у комплексе Агінскага, помнік архітэктуры барока. На першым паверсе была гасцёўня са скляпеннямі. На другім паверсе – жылыя пакоі, дзе адпачывалі стомленыя далёкім шляхам з Варшавы, Кракава, Вільні госці вялікага гетмана літоўскага. У прамавугольным двары размяшчаліся канюшні.У XX стагоддзі надбудаваны 3-і паверх. Цяпер тут размешчаны вучэбна-вытворчы

Рэпазіторый ГрГМУ

камбінат гарадскіх школ.

Аўстэрыя – помнік архітэктуры рэспубліканскага значэння.

Міхал Казімір Агінскі, быццам чараўнік, зрабіў цуд: ператварыў правінцыйны невядомы гарадок у буйны еўрапейскі асяродак культуры.

Літаратура:

1. Аляшкевіч Д.С.; Крэнь І.П., "Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў". – Слонім. Слонімская друкарня, 2002г.
2. Чыгрын С., "Тэатр у Слоніме" гісторыка-краязнаўчыя і мастацтвазнаўчыя артыкулы. – г. Слонім. Слонімская друкарня, 2008г.;
3. Цеханавецкі,А.Міхал Казімір Агінскі і "яго сядзіба музаў" у Слоніме. – Мн.:Беларусь,1993. – 176 стр.

## «ТАПАНІМІЯ СМАРГОНШЧЫНЫ»

УА «Гімназія №4 г. Смаргонь»

***Чырыца І.Я., ПФ***

Навуковы кіраўнік – Радзіён Л.У., настаўніца беларускай мовы і літаратуры

У спадчыну ад мінулых пакаленняў нам дасталася велізарная колькасць назваў населеных пунктаў, рэк і азёр, палёў і сенажацяў. На зямлі нашай Бацькаўшчыны не знойдзеш ніводнай назвы, якая б узнікла выпадкова. Калі ўважліва паглядзець, то выразна бачна, што яна паходзіць ці ад прыродных асаблівасцей асяроддзя, ці ад умоў вытворчай дзейнасці людзей, ці звязана з гістарычным мінулым народа, ці ўказваюць на прыналежнасць той ці іншай асобы.

Многія гістарычныя тапонімы найцяснейшым чынам звязаны з геаграфічнымі і прыродна-кліматычнымі фактарамі, бо яны ўзнікалі па берагах рэк і азёр , г.зн. у месцах, дзе найлепш за ўсё можна было ладзіць жыццё чалавеку. У беларускім алфавіце, бадай, няма ніводнай літары ,з якой не пачыналася б назва населенага пункта, у якой угадваецца штосьці з мясцовага ландшафту. У беларусаў ,як і ў іншых народаў, велізарны пласт тапаніміі так ці інакш звязаны з рэлігійнай тэматыкай. І тут няма нічога дзіўнага, бо пакуль беларусы прыйшлі да матэрыялістычнага разумення свету, у іх свядомасці многія прыродныя і сацыяльныя з`явы паўставалі ў розных містычных, незямных формах.

Існуе навука пра назвы – анамастыка, і ў ёй вялікі раздзел-тапаніміка. Слова гэта грэчаскае, складаецца з двух частак: топас-мясцовасць, месца і анома-імя. Карацей кажучы, імя месца, звязанага з

Репозиторий ГрГМУ